Да 1943 года акупанты займаліся вярбоўкай рабочай сілы ў Германію.

З першых дзён акупацыі патрыёты не змірыліся з парадкам новых гаспадароў. Як і па ўсёй краіне, стыхійна пачалася барацьба з акупантамі. Ініцыятарамі былі пакінутыя тут актывісты і мясцовыя камсамольцы. Ветрынскі падпольны райкам быў створаны ў верасні 1942 года, асноўная база якога знаходзілася ў партызанскім атрадзе "Мсцівец", а са снежня 1942 года – у брыгадзе імя Варашылава.

Нараджэнне партызанскага атрада "Смерць фашызму" адбылося 24 верасня 1942 года. Атрад выконваў агульную задачу па разгроме воласцяў, дробных паліцыянтаў, гарнізонаў і адначасова актывізаваўся на лініі камунікацый. А ў пачатку верасня 1942 года было прынята рашэнне аб стварэнні трэцяга атрада "За Радзіму". Пасля яго стварэння ў студзені 1943 года бюро падпольнага райкама партыі прыняла рашэнне аб стварэнні на тэрыторыі Ветрынскага раёна партызанскай брыгады імя Варашылава.

Дзякуючы ўзмацненню партыйнага ўплыву і папулярнасці партызан сярод насельніцтва, у партызанскія атрады сталі ўступаць цэлымі сем'ямі і вёскамі. У сакавіку 1943 года быў створаны камсамольска-маладзёжны атрад "КІМ" . У ліпені быў створаны яшчэ адзін атрад ─ "Бальшавік". І нарэшце, у жніўні арганізаваны атрад імя Гастэлы.

Такім чынам, канчаткова брыгада імя Варашылава сфарміравалася да канца жніўня 1943 года і налічвала ў сваім складзе 6 партызанскіх атрадаў: "Мсцівец", "Смерць фашызму", "За Радзіму", "КІМ", брыгада імя Гастэлы і "Бальшавік". Колькасць партызан складала 1300 чалавек.

29 чэрвеня 1944 года ─ гэта дзень вызвалення Ветрына. Вёска Ветрына і Ветрыншчына былі вызвалены ў ходзе Полацкай аперацыі войскамі першага Прыбалтыйскага фронту.

Ветрына за час Вялікай Айчыннай вайны перанесла ўсе жахі, якія прыгатавалі нашаму народу акупанты. Але, нягледзячы на гэта, наш народ, у тым ліку жыхары Ветрына і яго наваколля, не зламіўся, а наадварот, з вялікай мужнасцю і самаахвярнасцю... 

УДК 82.085

## КРАСАМОЎСТВА ЯК ПРЫКМЕТА КУЛЬТУРЫ МОВЫ

*А.А. Шаўкера, Ф.І. Сіўко*

Нельга гаварыць пра беларускую літаратурную мову, не закрануўшы тэмы красамоўства, прыгажосці роднай мовы, яе мілагучнасці і яскравасці. Я лічу, што тэма красамоўства з’яўляецца на сённяшні дзень вельмі актуальнай і ёй павінна надавацца больш увагі. На маю думку, кожны жыхар нашай слаўнай краіны павінен не проста добра ведаць родную мову, але і прыгожа ўжываць яе ва ўсіх сферах жыцця.

Красамоўства, або аратарскае мастацтва — па-мастацку распрацаванае вуснае маўленне, мэта якога — пераканаць слухачоў, узрушыць іх і схіліць да пэўных дзеянняў. Словам “красамоўства” абазначаюць таксама здольнасць асобнага чалавека гаварыць яскрава, прыгожа, змястоўна; здольнасць словам уплываць на іншых людзей, а выразам – “аратарскае мастацтва” – навуку аб



Витебский государственный технологический университет

красамоўстве. Такая навука называецца яшчэ рыторыкай (устарэлы тэрмін — “элаквенцыя”).

Аратарскае мастацтва зарадзілася ў глыбокай старажытнасці. Найбольш славутымі прамоўцамі антычных часоў былі Дэмасфен (384-322 гг. да н. э.) у Старажытнай Грэцыі і Марк Тулій Цыцэрон (106-43 гг. да н.э.) у Старажытным Рыме. Аратарскае мастацтва прайшло вялікі гістарычны шлях.

Сёння адрозніваюць маналагічныя і дыялагічныя жанры красамоўства. Да першых належаць наступныя роды аратарскага мастацтва: сацыяльна-палітычны, акадэмічны, сацыяльна-бытавы, судовы, лекцыйна-прапагандысцкі, ваенны, дыпламатычны, гандлёвы і царкоўна-багаслоўскі.

Навуковую базу тэорыі і методыкі аратарскага мастацтва ўтвараюць палажэнні тых грамадскіх навук (філасофіі, сацыялогіі, логікі, псіхалогіі, педагогікі, мовазнаўсгва і інш.), якія распрацоўваюць кожная па-свойму шматбаковую праблему чалавека і грамадства, кантактавання людзей, зносін паміж імі. Аднак прамоўніцкая практыка не абмяжоўваецца апорай на навуковыя рэкамендацыі. Яна патрабуе ад аратара максімальнага творчага падыходу. Тэксты публічных выступленняў розных тыпаў у сукупнасці складаюць аратарскую прозу. Аратарская проза садзейнічае фарміраванню ў межах літаратурнай мовы аратарска-публітыстычнага стылю і такім чынам уплывае на развіццё мовы ў цэлым.

На Беларусі здаўна атрымалі пашырэнне многія роды і віды красамоўства. Як аратар праславіўся Кірыла Тураўскі, «словы» якога сведчаць пра высокую культуру аратарскага мастацтва ў Старажытнай Русі 12 ст., пра сувязь з антычнымі і візантыйскімі традыцыямі.

У 1-й палове 15 ст. вядомасць набылі «словы» Г. Цамблака. У 16 ст. пашырыліся палемічна-рэлігійныя, палітычныя жанры аратарскага мастацтва (А.Краповіч, М.Сматрыцкі, С.Полацкі, Л.Сапега і інш.). У 17-18 ст. форма прамовы надавалася сатырычным і гумарыстычным творам (парадзіраванне). Да іх адносяцца, напрыклад, «Прамова Мялешкі», «Прамова Русіна» і інш.

У 19 ст. гэта традыцыя працягвалася ў вершаванай форме (“Віншаванне войта Навума” В.Дуніна-Марцінкевіча, “Імяніннае віншаванне Ігната Сліўкі” І.Мігановіча і інш.), але ўсё яскравей аратарская форма непасрэднага звароту да людзей выкарыстоўвалася з асветніцка-дэмакратычнымі, рэвалюцыйнымі мэтамі («Уставайма, братцы...» В.Каратынскага, «Праўда» Ф. Багушэвіча і г.д). Найбольш выразна магчымасці аратарскага звароту да народа раскрываюцца ў публіцыстычных маналогах К. Каліноўскага. Аднак гісторыя беларускага красамоўства распрацавана яшчэ недастаткова.

Выдатнымі прадстаўнікам сучаснага аратарскага мастацтва на Беларусі з'яўляліся Ф.Г. Шантыр, Б. А. Тарашкевіч, М. М. Галадзед, А.Р. Чарвякоў, С.В. Прытыцкі, В.З. Харужая.

Красамоўства, аратарскае мастацтва патрабуюць ад прамоўцы ведання пэўных законаў публічнага выступлення. У тым ліку і законаў, што дыктуюцца мовазнаўствам. Гэта законы тэхнікі маўлення (артыкуляцыя, дыкцыя, інтанацыя і інш.), культура мовы (націск, арфаэпія, выбар формы слова і г. д), вобразнасці (выкарыстанне тропаў, фігур, выслоўяў) і стылю мовы.

Аратарскае мастацтва — адзін з важных кампанентаў нацыянальнай культуры, найбольш цесна звязаных з узроўнем развіцця нацыянальнай мовы, з адукаванасцю яе носьбітаў, з дасканаласцю форм грамадскага жыцця.

Витебский государственный технологический университет

На жаль, сёння большасць людзей не ўсведамляюць у поўнай меры сэнс і значнасць тэрміна «красамоўства». Большасць з іх скажаюць гэтае паняцце, уяўляючы сабе, што з ужываннем слоў-паразітаў і лаянкавых слоў іх мова будзе гучней і выразней. Але ж атрымліваецца зусім наадварот.

Безумоўна, вельмі цяжка авалодаць такім відам мастацтва, як аратарскае. Але трэба кожны дзень працаваць над сабой, не шкадуючы сябе імкнуцца пазнаць гэтую цудоўную навуку — красамоўства. Таму што гэта рэч з'яўляецца неабходнай кожнаму з нас у працы, стасунках з іншымі людзьмі, наогул у жыцці.

Спіс скарыстаных крыніц

1. Старавойтава, Н. П. Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць / Н.П. Старавойтава. – Мінск, 2008.
2. Абабурка, М. В. Культура беларускай мовы / М. В. Абабурка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1970.
3. Беларуская мова : энцыклапедыя. – Мінск,1994.

*УДК 940.53(476)*

## ОТЦОВСКОЕ СЕРДЦЕ: БАТЬКА МИНАЙ

***Д.А. Науменко, В.Ф. Радецкая***

«Папа, за нас не волнуйся, никого не слушай, и к немцам не иди. Если тебя убьют, то мы бессильны и за тебя не отомстим. А если нас убьют, папа, то ты за нас отомстишь». От Великой Отечественной осталось много документов, письменных свидетельств, фото. Его написала зимой 1941 года отцу, командиру партизанского отряда, 14 - летняя Лиза Шмырёва, находясь в заложниках у гитлеровских карателей. Вместе с ней под замком сидели её младшие братишки и сестрёнка: 3 - летний Мишенька, 8 - летняя Зина и 12 - летний Серёжа. Записка, хранящаяся сейчас в мемориальном музее Минная Шмырёва в Витебске, в своё время дошла до адресата. Он потом долго носил её возле сердца, берёг свято.

Детей расстреляли… Сердечную боль и бескрайнюю тоску по безвинно погибшим кровиночкам своим он пронёс через всю жизнь.

Из книги воспоминаний Антона Белевича «У Батьки Миная» мы читаем: «Когда он закончил читать письмо, снова задымил своей чёрной прокуренной трубкой и в который раз припомнил пережитое. Говорит, а глаза полны слёз… «Что я тогда думал?.. Детки мои дорогие, родные мои. Ну, как вам передать, как поведать про боль мою? А что делать, что придумать? В бой рвутся мои хлопцы, готовы головы за вас положить. Но как вести мне их на танки, на дзоты, под немецкие пушки? Перебьют…. Не простят мне этого их дети, матери, жёны, родная земля не простит…. Да, страшные были дни, а того хуже – ночи. Чудилось: встают из могилы, ручонки тянут ко мне…. Какой тут уж сон. Задремлю на минутку и все их голоса слышу: «Отомсти, батька, фашистам за наши муки, за смерть нашу». И я мстил! Я шел в самое пекло, под пули, но меня уже и пули вражьи не брали…»

Он принес себя в жертву во имя всех нас: и живших тогда, и тех, кто придет после. Ему, грозному воину, не ведавшему страха, так хотелось в те бесконечные холодные, одинокие ночи примчаться к ним, к своим маленьким, родненьким деткам, и пусть в последний раз, но обнять их. И даже зная, что никому не будет спа-

Витебский государственный технологический университет